Падтрымай "Вясну" на PATREON

Прысуд па справе зборшчыка подпісаў за “Народны Рэферэндум”: 3 сутак арышту (дапоўнена)

31.10.2014 **Тэгі**: затрыманні



Сёння суддзя Паўлоўская абвесціла прысуд зборшчыку подпісаў за “Народны Рэферэндум” Уладзіславу Кошалеву: 3 сутак арышту.

Зборшчыка подпісаў за “Народны Рэферэндум” у выніку затрымалі да суда па арт. 23.34 (падрыхтоўка правядзення масавага мерапрыемства). Менавіта так ацаніў яго дзеянні намеснік начальніка Партызанскага РАУС Альшэускі. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні “Руху за Свабоду” Юрый Губарэвіч праз facebook.

28 кастрычніка актывіст Руху за Свабоду” **Уладзіслаў Кошалеў** збіраў подпісы за “Народны рэферэндум” ў інтэрнаце аднаго з ПТВ на вуліцы Ваўпшасава ў Менску. Гэта не спадабалася намесніку дырэктара па ідэалогіі гэтай навучальнай установы, якая адабрала ў актывіста падпісныя лісты і выклікала міліцыю. Стаміўшыся чакаць міліцэйскі нарад, Уладзіслаў сыйшоў з інтэрнату.


Сёння Уладзіслаў Кошалеў разам з палітыкамі **Андрэем Дзмітрыевым, Юрыем Губарэвічам** і журналістам, вырашылі сустрэцца з чыноўніцай, каб патлумачыць законнасць збору подпісаў і вярнуць падпісныя лісты. Пад час размовы намесніца дырэктара ПТВ Казлова ізноў выклікала міліцыю, якая затрымала зборшчыка подпісаў і адвезла яго ў РУУС Партызанскага раёна да намесніка начальніка РУУС, дзе быў складзены пратакол апытання.

Намеснік старшыні “Руху за Свабоду” Юрый Губарэвіч спрабаваў патлумачыць, што пры зборы подпісаў ніякі закон не быў парушаны. У выніку яму прапанавалі прывесці статут арганізацыі і выпіску аб тым, што Кошалеў з’яўляецца сябрам Руху.


Пакуль жа Уладзіслаў Кошалеў знаходзіцца ў РУУСе Партызанскага раёна.

Твитнуть









ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023



ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

Камунікат
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO


HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh













E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY